# НАВУЧАННЕ ПЕРШАКЛАСНІКАЎ ЗВЯЗНАМУ ЧЫТАННЮ

З М Е С Т

Прадмова ……………………………………………………………………3
Авалоданне гука-літарнымі абазначэннямі ………………………………7
Фарміраванне складовага чытання ………………………………………16
Навучанне злітнаму чытанню слоў ………………………………………25
Навучанне звязнаму чытанню сказа ………………………………………33

## П Р А Д М О В А

Праграма пачатковай школы па чытанню прадугледжвае ўжо ў 1 класе вывучэнне дастаткова шырокага і разнастайнага матэрыялу аб нашай Радзіме, яе прыродзе, аб розных баках жыцця і дзейнасці савецкіх людзей, які ўзбагачае першакласнікаў вобразнымі ўяўленнямі, ведамі аб навакольным асяроддзі. На ўроках матэматыкі вучням 1 класа даводзіцца чытаць у падручніку, а затым рашаць розныя тэкставыя задачы. Для поўнага і глыбокага асэнсавання зместу твораў, якія прапануюцца ў кнізе для чытання, асэнсавання ўмоў і пытанняў матэматычных задач важна, каб у дзяцей да канца навучання грамаце быў сфарміраваны дастаткова дасканалы навык свядомага, правільнага і выразнага чытання. Ад навыкаў чытання залежыць поспех засваення дзецьмі ведаў па роднай мове, прыродазнаўству, матэматыцы.

Такім чынам, з’яўляючыся важным відам моўнай дзейнаці, чытанне ў пачатковых класах выступае ў якасці своеасаблівага прадмета навучання і адначасова сродка навучання[1].

Перш чым абмяркоўваць, якое чытанне можа выконваць функцыі сродка навучання, разгледзім, што сабой уяўляе навык чытання і якія этапы яго станаўлення.

Чытанне ўяўляе сабой складаны псіхафізіялагічны працэс, у якім умоўна можна вылучыць два бакі – тэхнічны і сэнсавы.

Тэхніка чытання і разумення сэнсу таго, што чытаецца, цесна ўзаемазвязаны. Больш дасканалая тэхніка садзейнічае лепшаму разуменню

[1] Обучение в 1 классе: Книга для учителя. М., 1973, с. 90.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сэнсу, дазваляе засвоіць больш складаны па зместу і мове тэкст. З другога боку, працэс зрокавага ўспрымання тэксту аблягчаецца або становіцца больш цяжкім у залежнасці ад устаноўкі чытача на пэўны змест.

Увогуле навык чытання складаецца з чатырох галоўных кампанентаў: свядомасці, выразнасці, правільнасці і бегласці.

Свядомасць з’яўляецца вядучым кампанентам чытання. Свядомым лічыцца чытанне, пры якім дзеці разумеюць (могуць растлумачыць) значэнні слоў, сказаў, сэнс таго, што прачытана.

Пад выразнасцю разумеецца правільнае ўжыванне паўз, націскаў, інтанацыі, дастаткокая гучнасць чытання.

Правільнасць чытання заключаецца ў чытанні без замен, пропускаў, перастановак літар (гукаў), складоў, слоў, адпаведнасці нормам арфаэпіі.

Пад бегласцю чытання разумеецца колькасць знакаў, якія чытаюцца за пэўны адрэзак часу.

У вопытнага чытача сэнсавы і тэхнічны бакі чытання зліты ў адзін цэласны акт. Гэта сфарміраванае дзеянне. Тэхнічныя аперацыі ажыццяўляюцца чытачом аўтаматычна. Аднак, як і кожны складаны навык, чытанне ў працэсе свайго развіцця праходзіць шэраг этапаў.

Т.Г. Ягораў вылучае тры асноўныя этапы авалодання дзецьмі чытаннем: аналітычны, сінтэтычны і этап аўтаматызацыі[2].

“Акрэсленыя намі э тапы, -- піша Т.Г. Ягораў, -- не трэба ўяўляць сабе ў выглядзе зусім адасобленых, пастунова змяняючых адзін аднаго часовых адрэзкаў. Асобныя ступені развіцця чытання больш правільна ўяўляць у выглядзе адрэзкаў, канцы якіх налягаюць адзін на аднаго”[3]

Кожны з названых этапаў авалодання чытаннем адрозніваецца ад іншых своеасаблівай псіхалагічный структурай. Адной з адметных рыс з’яўляецца тое, што на кожным этапе стаіць асобая задача навучання, у адпаведнасці з чым па-рознаму будуюцца суадносіны паміж тэхнікай чытання і разуменнем таго, што прачытана.

<u>1 этап (аналітычны)</u> Т.Г. Ягораў падзяляе на дзве ступені:

а) ступень авалодання літарамі і літарнымі абазначэннямі гукаў; б) ступень складовага чытання.

[2] Гл.: Егоров Т.Г. Психология навыка чтения. М., 1953.
[3] Там жа, с. 27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Авалоданне гука-літарнымі абазначэннямі ажыццяўляецца паступова на працягу даволі доўгага перыяду. Прычым з пэўнага моманту знаёмства з кожнай наступнай літарай адбываецца на фоне ўсё больш дасканалага навыка чытання. Таму псіхалагічная структура гэтага працэсу не з’яўляецца данароднай, яна відазмяняецца па меры засваення дзецьмі граматы.

Адзінкай чытання на першым этапе з’яўляецца літара, чытанне складоў – гэта асобная аперацыя.

Характэрным для гэтай ступені з’яўляецца тое, што разуменне аддзелена ад працэсу ўспрымання. Свядомай мэтай, якую ставіць перад навучэнцам педагог і для дасягнення якой дае дзіцяці адпаведный прыёмы, з’яўляецца аднаўленне гукавой формы склада і слова па яго літарнай мадэлі. Дзіця перш за ўсё чытае слова, а потым ужо ўсведамляе яго сэнс. Гэтым тлумачыцца імкненне дзяцей паўтараць толькі што прачытанае слова. Разуменне тут, адзначае Д.Б. Элькон́ін, выступае хутчэй як сродак кантролю за правільнасцю дзеяння, чым як асноўная задача – зразумеў, значыць правільна прачытаў[4]. Таму дзецям на пачатковай ступені навучання прапануюцца для чытання толькі добра знаёмыя словы. Такім чынам, “хоць у першапачатковым чытанні разуменне сэнсу таго, што чытаецца, аказваецца ў свядомасці, актуальна ўсведамляюцца яшчэ спосабы чытання, само дзеянне”[5].

Другой характэрнай рысай першай ступені авалодання чытаннем з’яўляецца чытанне дзецьмі сказаў і нават маленьких апавяданняў па прынцыпу далучэння слоў адно да другога. Словы чытаюцца паасобку без аб’яднання іх у фразавай інтанацыі.

На другой ступені аналітычнага этапу -- ступені складовага чытання – адзінкай чытання з’яўляецца склад, які дазеці паступова пачынаюць успрымаць цалкам, як бы пазнаюць “у твар”.

На гэтай ступені дзеці ўжо выяўляюць тэндэнцыю чытаць словамі.

Пры чытанні сказа слова спачатку выступае для вучня як самастойная адзінка, а потым усведамляецца як частка фразы. Гэта часта прыводзіць да страты сэнсавай ніці апавядання. У такім выпадку дзеці зноў прыбягаюць да паўтарэння. Як і раней, разуменне на другой ступені ідзе не сумесна з чытаннем, а следам за ім.

---

[4] Гл.: Эльконин Д.Б. Как учить детей читать. М., 1976.
[5] Климанова Л.Ф. Проблема совершенствования навыка чтения младших школьников. М., 1976, с. 8.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сінтэтычны этап авалодання чытаннем пачынаецца з моманту станаўлення цэласных прыёмаў чытання – цэлымі словамі і словазлучэннямі.

На сінтэтычным этапе адбываецца паступовае скарачэнне дзеяння аднаўлення гукавой формы склада і слова. Яно пераходзіць ва ўнутраны план, ператвараючыся ў аперацыю для новага свядомага дзеяння – усведамлення зместу сказа, а затым невялікага звязнага тэксту. Словы ў сказе інтанацыйна звязваюцца, становяцца для дзіцяці членамі фразы.

Аднак працэсы ўспрымання і разумення таго, што прачытана, яшчэ раз’яднаны. Адзін з працэсаў тармозіць другі. Вучань спрабуе аперціся на сэнсавую здагадку, але не здольны хутка і дакладна праверыць яе, у выніку здагадка нярэдка ператвараецца ва ўгадванне слоў.

Сінтэз на пачатковай ступені другога этапу яшчэ слабы. Гэта выяўляецца ў тым, што ў працэсе чытання апавядання не ажыццяўляецца інтанацыйная сувязь сказаў. Па вызначэння Т.Г. Ягорава, гэта сінтэтычннае невыразнае чытанне. Наступная ступень сінтэтычнага чытання – кантэкстнае чытанне, для якога характэрна інтанацыйнае аб’яднанне сказаў.

Аб аўтаматызме чытання, навыку, што ўжо склаўся, гаворыць прама прапанцыянальная сувязь паміж хуткасцю чытання і яго правільнасцю (чым больш хуткі тэмп чытання, тым менш памылак робіць чытач).

Са сказанага зразумела, што толькі пачынаючы з этапа сінтэтычнага чытання калі вучань засвойвае чытанне цэлымі словамі і словазлучэннямі (сказамі), гэтае дзеянне можа выступаць як сродак навучання розным прадметам курса пачатковай школы.

Сказ, які складаецца са слоў, адлюстроўвае сувязі паміж прадметамі, працэсамі рэальнага свету. Успрыманне сказа і яго разуменне не зводзіцца да разумення асобных слоў. Словы трэба ўспрыняць у іх сувязях. Менавіта ўстанаўленне камунікатыўна-сінтаксічных сувязей паміж словамі ляжыць у а аснове звязнага, г.зн. хуткага свядомага чытання.

Грунтуючыся на даных псіхолага-педагагічных даследаванняў, на асабістых назіраннях і аналізе навыка звязнага чытання, мы вылучаем наступныя ступені авалодання пачатковым звяным чытаннем:

1) выпрацоўка ўвагі да граматычнай формы слова (прыслоўным адзнакам і прымыкаючым службовым словам, што паказваюць адносіны знамянальнага слова да іншых слоў сказа);
2) злітнае чытанне асобнага слова;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) злітнае чытанне фанетычнага слова (знамянальнага слова з прымыкаючымі службовымі словамі або часціцамі);
4) фарміраванне ўмення чытать сказы з націскам у кожным слове;
5) аб’яднанне знамянальных (і фанетычных слоў) у словазлучэнне, чытанне яго без падвойнага прачытвання;
6) выразнае звязнае чытанне сказа з лагічным націскам і адпаведнай знаку прыпынку інтанацыяй.

Першыя пяць ступеняў служаць фарміраванню ў першакласнікаў умення аднаўляць гукавую форму слова і сказа. Шостая ступень -- выпрацоўка ўласна звязнага свядомага чытання.

Меркаванне аб існаванні названых ступеняў авалодання звязным чытаннем паслужыла асновай для стварэння методыкі навучання дзяцей звязнаму чытанню на занятках па грамаце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ